View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk
brought to you by CORE
provided by Belarusian State Pedagogical University Repository

**БЕЛАРУСКА-ПОЛЬСКІЯ ПАГАДНЕННІ 1944-1945 ГГ.
ЯК НАРМАТЫЎНА-ПРАВАВАЯ БАЗА ПЕРАСЯЛЕННЯ НАСЕЛЬНІЦТВА
ПАМІЖ ПОЛЬШЧАЙ І БССР**

**А. Вялікі, БДПУ (Мінск)**

Вызваленне Беларусі ў ліпені 1944 г. дазволіла прыступіць не толькі, для наладжвання мірнага жыцця, але і палажыла пачатак міжнароднай дзейнасці БССР. Такую магчымасць даваў рэспублціцы закон аб прадастаўленні саюзнай рэспубліцы паўнамоцтваў у галіне міжнароднай дзейнасці, які быў прыняты ВС СССР 1 лютага 1944 г. Сесія ВС БССР (сакавік 1944 г.) замацавала ў Канстытуцыі БССР права ўступаць у непасрэдныя зносіны з замежнымі краінамі, заключаць з імі пагадненні, абменьвацца консульскімі прадстаў-ніцтвамі і прыняла закон аб стварэнні наркамата замежных спраў БССР (НКЗС).

Першымі міжнароднымі актамі, якія заключыў урад БССР з замежнай краінай пасля прадастаўленне ёй такога права стала падпісанне ў верасні 1944 г. пагаднення паміж урадам БССР і Польскім камітэтам нацыянальнага вызвалення (ПКНВ) аб дабраахвотнам абмене насельніцтвам, а ў лістападзе 1945 г. дадатко-вага пратакола да гэтага пагаднення.

Неабходнасць падпісання беларуска-польскага пагаднення да 9 верасня 1944 г. была выклікана ўстанаўленнем новай савецка-польскай мяжы, а таксама жаданнем беларускага і польскага кіраўніцтва зрабіць насельніцтва абедзьвух краін больш этнічна аднародным[1, С.197-198]. Пагадненне прадстаўляла магчымасць палякам, якія пражывалі ў заходніх абласцях Беларусі дабраахвотна выехаць у Польшчу, а беларусам Беласточчыны, якая адыйшла да Польшчы, выехаць у БССР.

Напачатку верасня 1944 г. урад Беларусі распачаў перамовы з ПКНВ аб умовах перасялення насельніцтва. У выніку гэтых перамоваў 9 верасня 1944 г. у Любліне было падпісана пагадненне аб эвакуацыі польскіх грамадзян з тэрыторыі БССР у Польшчу і беларускага насельніцтва з тэрыторыі Польшчы ў Беларусь [1, С.197-198].

Аднак пры падпісанні пагаднення беларускі бок дапусціў значныя пралікі. Так, значнай памылкай беларускага ўрада і НКЗС з'явілася вызначэнне даты заканчэння перасялення. Урад БССР планаваў скончыць перасяленне да 1 лютага 1945 г. Аднак масавая рэгістрацыя палякаў на выезд у студзені-красавіку 1945 г. паказала, што ні польскія, ні беларускія ўлады не спрагназавалі, што сотні тысяч палякаў выкажуць намер перасяліцца ў Польшчу. У студзені 1945 г. стала відавочна, што ў вызначаны тэрмін (да 1 лютага 1945 г.) не ўдасца зарэгістраваць і перасяліць у Польшчу ўсіх жадаючых. Адным з першых, хто зразумеў гэта быў Галоўны ўпаўнаважаны СНК БССР у Польшчы І.Варвашэня. Яшчэ ў снежні 1944 г. у запісцы, накіраванай наркаму замежных спраў БССР К.Кісялёву ён адзначаў, што : "Улічваючы, што да 1 лютага 1945 г. перавезці ўсе зарэгістраваныя беларускія, рускія, украінскія гаспадаркі немагчыма, таму неабходна распачаць перамовы з польскім урадам аб прадоўжанні тэрміна пагаднення да 15 красавіка 1945 г." [2, л.73]. Пазней, 8 студзеня 1945 г., ён зноў накіроўвае К.Кісялёву ліст, у якім больш катэгарычна сцвярджае аб немагчымасці перасялення насельніцтва ў адзначаны ў пагадненні тэрмін і просіць К.Кісялёва хадайнічаць перад урадам БССР аб прадаўжэнні гэтага тэрміна да 15 красавіка 1945 г. [3, л. л.16].

Іншага кшталту праблемы меў і польскі бок. Так, Генеральны ўпаўнаважаны часовага ўрада Польшчы В.Вольскі накіраваў 23 студзеня 1945 г. Галоўнаму ўпаўнаважанаму Польшчы ў Беларусі С.Вішнеўскай ліст, у якім паведамляў, што ў студзені 1945 г. няма ніякай магчымасці прыняць у Польшчы перасяленцаў з Беларусі. Ён прасіў С.Вішнеўскую не накіроўваць людзей у Польшчу, а наадварот "за ўсялякі кошт затрымаць гэтую хвалю" (мелася на ўвазе хваля перасяленцаў - А.В.) [4, л.10].

Улічываючы складўшуюся сітуацыю 26 студзеня 1945 г. Старшыня СМ Польшчы Э.Асубка-Мараўскі накіраваў Старшыні СНК БССР П.Панамарэнку Ноту, у якой выказвалася жаданне прадоўжыць тэрмін перасялення да 1 мая 1945 г. [5, л. 67]. Беларускі бок разглядзеўшы Ноту і ўлічыўшы жаданне польскага ўрада накіраваў 19 лютага 1945 г. ліст на імя Э.Асубкі-Мараўскага, ў якім паведамлялася аб згодзе "прадоўжыць да 1 мая 1945 г. эвакуацыю беларускага насельніцтва з тэрыторыі Польшчы і польскіх грамадзян з тэрыторыі БССР" [5, л.69].

Аналізуючы перапіску П.Панамарэнкі і Э.Асубкі-Мараўскага неабходна ўсведамляць, што без дазволу ўрада СССР урад Беларусі не мог самастойна прыняць такое рашэнне. Гэтага пацвярджае ліст наркама замежных спраў БССР К.Кісялёва, які ён накіраваў 11 студзеня 1945 г. В.Молатаву. У ім ён прасіў урад СССР "разглядзець і прыняць адпаведнае рашэнне па пытанню дадатковага пагаднення паміж урадамі БССР і ПКНВ аб эвакуацыі беларускага насельніцтва з тэрыторыі Польшчы і польскіх грамадзян з тэрыторыі БССР". [5, л.1]. Толькі атрымаўшы дазвол Цэнтра урад Беларусі даў палякам згоду на яго прадоўжанне.

Адзначым, што і да 1 мая 1945 г. не ўдалося перасяліць усіх жадаючых як з Польшчы ў Беларусь, так і з БССР у Польшчу. Улічваючы гэта ўрад Польшчы прапанаваў ураду БССР "правесці абмен думкамі па гэтаму пытанню паміж Беларускім і Польскім урадам" [5, л.148]. Была дасягнута дамоўленасць аб сустрэчы ў Варшаве ўрадавых дэлегацый і абмеркавання ўсіх пытанняў звязаных з прадоўжаннем тэрміна перасялення. 24 лістапада 1945 г. у Варшаве адбыліся беларуска-польскія перамовы, ў якіх з польскага боку прымалі удзел віцэ-міністр, Генеральны ўпаўнаважаны польскага ўрада па справах рэпатрыяцыі А.Вольскі і Галоўны ўпаўнаважаны польскага ўрада па справах эвакуацыі С. Вішнеўская [5, л.119].

Асноўнымі пытаннямі, якія вылучыў польскі бок, з'яўляліся наступныя: прадоўжанне тэрміна рэгістрацыі да 31 студзеня 1946 г.; стварэнне спрыяльных ўмоў для ад'езду тых, хто ўжо зарэгістраваўся; дазвол на перасяленне ў Польшчу татар і караімаў, якія раней з'ўляліся грамадзянамі Польшчы.

Перамовы ішлі даволі цяжка, асабліва спрэчнымі з'яўляліся першае і трэцяе пытанні. Польская дэлегацыя настайвала на прадоўжанні тэрміну рэгістрацыі да 31 студзеня 1946 г., матывуя гэтае тым, што ў сувязі з познім падпісаннем дадатковага Пратакола немагчыма будзе забяспечыць рэгістрацыю ўсіх жадаючых. Беларускі бок наадварот заняў жорсткую пазіцыю і настаяў, каб рэгістрацыя была працягнута толькі да 15 студзеня 1946 г., што і было зафіксавана ў дадатковым пратаколе[5, л.120]. Жорсткая пазіцыя

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

беларускай дэлегацыі абумоўлівалася тым, што 11 лістапада 1945 г. быў падпісаны дадатковы пратакол паміж урадамі СССР і Часовым урадам нацыянальнага адзінства Польшчы аб працягу тэрміну рэгістрацыі толькі да 15 студзеня 1946 г. і беларускі ўрад, ведая аб гэтым, не мог выйсці за яго межы [6, С. 592].

Беларуская дэлегацыя адхіліла патрабаванні польскага боку, аб безперашкодным выездзе ў Польшчу татар і караімаў як не маючыя дачынення да дадатковага беларуска-польскага Пратакола. Цяжкасці выклікала абмеркаванне пытання аб рабоце прадстаўніцтва СНК БССР у Лодзі. У сувязі з тым, што яно пачало працаваць без згоды з польскім бокам, палякі выказалі рашучы пратэст супраць яго працы і патрабавалі яго закрыцця. Беларуская дэлегацыя, ўлічыўшы абгрунтаванае патрабаванне палякаў, пагадзілася з ім. Астатнія пытанні былі вырашаны па абаюднай згодзе і 25 лістапада 1945 г. Старшыня Савета Міністраў Польшчы Э.Асубка-Мараўскі і намеснік Старшыні СНК БССР А.Шаўроў падпісалі дадатковы Пратакол аб працягу тэрміну перасялення да 15 чэрвеня 1946 г. [7, л.49].

Адзначым, што беларуская дэлегацыя дамаглася змянення шэрагу артыкулаў Пагаднення ад 9 верасня 1944 г., якія не адпавядалі дзяржаўным інтарэсам Беларусі. Найбольш істотныя змяны перацярпеў артыкул 5, які тычыўся перавозкі насельніцтва. Гэты артыкул у вераснёўскім Пагадненні значыў, што "Перавозку эвакуіраваных з тэрыторыі Польшчы ў Беларускую ССР і з тэрыторыі Беларускай ССР бярэ на сябе Урад Беларускай ССР, па магчымасці, выдзяляючы транспартныя сродкі" [8, л.17]. Таму, падпісываючы 25 лістапада 1945 г. дадатковы Пратакол беларуская дэлегацыя дамаглася каб артыкул 5 быў запісаны зусім ў іншай рэдакцыі. У ім пазначалася, што "Дамаўляючыяся бакі забяспечываюць, па магчымасці, ўсіх эвакуіруемых транспартам, кожны на сваёй тэрыторыі" [9, л.22]. Як бачна, гэты пункт Пагаднення працярпеў істотныя змяненні на карысць Беларусі.

Вельмі істотным для беларускага боку было ўнясенне ў дадатковы Пратакол спецыяльнага артыкула, які абавязваў урад Польшчы забяспечыць ахову прадстаўнікоў СНК БССР па перасяленню і беларусаў, якія перасяляліся ў БССР ад нападаў польскага падполля. Нагадаем, што ў Пагадненні ад 9 верасня 1944 г. такога артыкула ўвогуле не было. У ім ад польскага ураду патрабавалася "Стварыць спрыяльныя ўмовы для працы ўпаўнаважаных Беларускага Ураду на польскай тэрыторыі па рэгістрацыі беларусаў, якія жадаюць выехаць у Беларусь з Польшчы, забяспечыць ахоўвай асабістую безапаснаць як апарата ўпаўнаважаных, так і эвакуіруючага насельніцтва ў Беларусь і насельніцтва, якое эвакуіруецца ў Польшчу" [10, л.19]

Адзначым, што стаўленне беларускага кіраўніцтва да праблемы падполля і яго ахвяр адлічаліся непаслядоўнасцю. З аднаго боку, яно не магло не рэагаваць на факты забойстваў, грабежу, гвалту як перасяленцаў, так і ўпаўнаважаных СНК БССР. З другога – значна занізіла як чалавечыя, так і матэрыяльныя страты панесеныя беларусамі. Так, у дакладной запісцы К.Кісялёва, накіраванай у маі 1947 г. загадчыку 4 Еўрапейскім аддзелам МЗС СССР А.Аляксандраву паведамлялася, што пад час перасялення 5 упаўнаважаных СНК БССР былі забіты, два паранены, а 283 гаспадаркі на шляху ў БССР былі абрабаваны. У сувязі з гэтым урад БССР патрабаваў ад ураду Польшчы кампенсаваць страты абрабаваным у памеры 10 млн. рублёў. Сем'ям забітых упаўнаважаных Польскі ўрад павінен быў сплаціць грашовую кампенсацыю і выплачваць пенсіі за страту кармільца [11, л.27].

Аднак аналіз выніковага пратакола, падпісанага беларускім і польскім бакамі аб сканчэнні тэрміну перасялення (май 1947 г.) не ўтрымлівае пунктаў аб матэрыяльнай кампенсацыі з боку Польшчы за страты, панесеныя перасяленцамі і ўпаўнаважанымі СНК БССР пад час перасялення. Не зразумелым з'яўляецца і той факт, чаму К.Кісялёў так занізіў колькасць абрабаваных і загінуўшых беларусаў. Ён, як Міністр МЗС БССР, ведаў, што за ўвесь перыяд перасялення было забіта 8 і паранена 16 упаўнаважаных СНК БССР па перасяленню. Да таго ж, ахвярамі падполля і бандыцкіх груповак стала звыш 500 беларусаў, якія зарэгістраваліся на выезд у БССР.

Снежань 1946 г. падвёў рысу пад двума гадамі працы па перасяленню. Так, 13 мая 1947 г. на сумесным пасяджэнні Упаўнаважаных польскага ўрада па справах эвакуацыі і Галоўнага прадстаўніка СМ БССР па эвакуацыі быў падпісаны выніковы Пратакол аб сканчэнні перасялення. У §1 Пратакола адзначалася, што "эвакуацыя польскіх грамадзян з тэрыторыі заходніх абласцей Беларускай ССР ў Польшчу пачатая 15 верасня 1944 г. поўнасцю скончана 31 снежня 1946 г. Уся праца па перасяленню польскіх грамадзян праводзілася ў строгай адпаведнасці з умовамі і канкрэтнымі патрабаваннямі адзначанага Пагаднення і дадатковага Пратакола ад 25 лістапада 1945 г. "Аб прадоўжанні тэрміна эвакуацыі да 15 чэрвеня 1946 г.", а таксама дазволу ўрада Беларускай ССР прадоўжыць эвакуацыю да 1 студзеня 1947 г.".

Аналіз пратакола выклікае шэраг пытанняў, на якія даволі складана адказаць. Па-першае, існуе істотная разніца ў лічбах прыведзеных у §1 Пратакола і выніковых лічбах, прадстаўленых у СМ БССР Галоўным прадстаўніцтвам па эвакуацыі. Так, у Пратаколе пазначана, што вусных і пісьмовых заяў на перасяленне паступіла ад 146 808 гаспадарак, у якіх налічвалася 499 648 чалавек. У той жа час, па дадзеных Галоўнага прадстаўніцтва СМ БССР па стану на 10 чэрвеня 1946 г. зарэгістравалася 156 494 гаспадарак агульнай колькасцю 535 284 грамадзяніна. Аднак, калі ў гэты лік уключыць яшчэ 7 630 чалавек, якія зарэгістраваліся на выезд і выехалі з 15 чэрвеня па 31 снежня 1946 г., то агульная лічба зарэгістраваных складае 542 914 чалавек. Такім чынам, розніца ў лічбах зарэгістраваных на выезд складае 43 266 чалавек. У той жа час колькасць пераехаўшых на сталае месца жыхарства ў Польшчу як у Пратаколе, так і ў дадзеных Галоўнага прадстаўніцтва поўнасцю супадае - 238 782 грамадзяніна назаўсёды пакінулі Беларусь. Такім чынам, пытанне чаму і хто "згубіў" з ліку зарэгістраваных болей як за 40 тыс. чалавек застаецца адкрытым.

Па-другое, існуе значная разніца ў абагульняючых лічбах прыведзеных у афіцыйных беларускіх дакументах і лічбах, якія прыводзяць польскія гісторыкі. Напрыклад, Я.Чарнікевіч сцвярджае, што пад час перасялення 1944-1947 гг. у Польшчу пераехала 274 163 грамадзяніна [12, S.131]. Калі параўнаць гэтую лічбу з той, якая прыведзена ў выніковым Пратаколе, падпісаным С.Вішнеўскай і У.Царуком, то атрымліваецца розніца ў 35 378 чалавек.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Неабходна адзначыць, што польскі бок пасправабаваў ініцыяваць перад беларусамі пытанне аб працягу перасялення і ў 1947 г. Так, на пачатку сакавіка 1947 г. Старшыня СМ Польшчы Ю.Цыранкевіч накіраваў намесніку міністра замежных спраў СССР Я.Вышынскаму ліст, у якім паведамляў, што польскі бок абмеркаваў пытанне аб працягу перасялення паміж Польшчай і БССР. Аднак МЗС СССР палічыла немэтазгодным працягваць перасяленне аб чым і паведаміла Ю.Цыранкевічу.

Такім чынам беларуска-польскае пагадненне ад 9 верасня 1944 г. І дадатковы пратакол ад 25 лістапада 1945 г. з'явіліся нарматыўна-прававой базай, і першымі міжнароднымі двухбаковымі пагадненнямі, якія заключыў урад Беларусі з замежнай краінай абмене насельніцтвам.

**Літаратура і крыніцы**


1. Снапкоўскі У. Савецка-польскія пагадненні аб абмене насельніцтвам 1944-1945 гг. // Энцыклапедыя гісторыя Беларусі: / Гал. Рэд. Г.П.Пашкоў.-Мінск: Бел.энцыкл., 2001.-Т.6. Кн.1.
2. НАРБ, ф.7, воп.3, спр.1902. Звесткі і дакладныя запіскі аб перасяленні грамадзян з Польшчы ў Беларусь і з Беларусі ў Польшчу. 16 лістапада 1944 г. – 1 кастрычніка 1950 г.
3. НАРБ. ф.7, воп.3, спр.1905. Перапіска з раеннымі ўпаўнаважанымі па эвакуацыі, спісы грамадзян польскай нацыянальнасці, якія прайшлі змешаную камісію. 30 снежня 1944 г. – 20 снежня снежня 1945 г.
4. НАРБ, ф.7, воп.3, спр.1916. Перапіска з Галоўным прадстаўніком і раённымі прадстаўнікамі аб перасяленні і рэпатрыяцыі. 21 студзеня 1945 г. – 24 лістапада 1945 г.
5. НАРБ, ф.788, воп.1, спр.10. Дакладныя запіскі і перапіска з урадам СССР і Польшчы аб ходзе эвакуацыі. 11 студзеня 1945 г. – 31 снежня 1945 г.
6. Документы и материалы по истории советско-польских отношений: В 12 т. / Ред. коллегия И.А.Хренов, В.Т.Ковальский и др., М.: Наука, 1974. - Т. 8: январь 1944 г. - декабрь 1945 г. - 680 с.
7. НАРБ, ф.789, воп.1, спр.26. Інструкцыі СНК БССР і Галоўнага ўпаўнаважанага СНК БССР па эвакуацыі аб рабоце райупаўнаважаных на тэрыторыі Полльшчы і планы рассялення эвакуіраваных з Польшчы ў БССР. 6 кастрычніка 1944- - 16 верасня 1945 г.
8. Архіў МЗС РБ, ф.907, воп.7, спр.112,
9. НАРБ, ф.788, воп.1, спр.24. Дакладныя запіскі аб выніках эвакуацыі насельніцтва. 10 ліпеня 1946 г. – 17 жніўня 1947 г.
10. НАРБ, ф.788, воп.1, спр.22. Пратаколы сумесных пасяджэнняў Галоўных прадстаўнікоў СМ БССР і упаўнаважаных Польскага ўрада па эвакуацыі і выніковыя дадзеныя аб колькасці эвакуіраваных грамадзян з Польшчы. 31 снежня 1946 г. 31 мая 1947 г.
11. НАРБ, ф.788, воп.1. спр.23. Дакладныя запіскі аб выніках эвакуацыі насельніцтва. 8 ліпеня 1946 г. - 15 кастрычніка 1946 г.
12. J.Czerniakiewicz Repatriacja ludnosci Polskiej z ZSRR 1944-1948. Warszawa: PWN. 1987.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ